**С. А. Сігаева**

## ТРЫКАЛОР І ЯГО СІМВОЛІКА Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

Грамадства ўжо з першых перыядаў свайго існавання і развіцця нязменна сутыкалася з праблемамі сімвалізацыі навакольнага свету. Ператварэнне чалавека першабытнага ў чалавека разумнага суправаджаецца пераходам ад пэўна-пачуццёвых формаў мыслення да абстрактна-вобразных. Ва ўсіх без выключэння сферах жыцця, асабліва на сучасным этапе, мы сутыкаемся

з сімваламі. Можна казаць аб існаванні навуковых і абрадавых сімвалаў, аб сімвалах выяўленчага мастацтва, геральдыкі, астралогіі, рэлігіі і канешне мастацкай літаратуры.

Сімвал (*грэч. Symbalon* ‘знак, азначальная прыкмета’) –канцэнтраваная ўмоўная форма адлюстравання і фіксацыі ведаў. Існуюць розныя віды сімволікі: аб’ектная, персанажная, знакавая. Як мастацкі прыём сімволіка пашырана ў фальклоры і літаратуры. Яна мае істотнае значэнне для разумения сістэмы вобразных асацыяцый мастацкіх тэкстаў. Асобае месца ў літаратурнай спадчыне кожнай краіны займае сімволіка колераў.

Мастацкая сістэма беларускага фальклору ўзнікла ў язычніцкі перыяд, ці як яго яшчэ называюць паганскі. Паганства не было вузкалакальнай з’явай. Асновай яго з’яўляецца паняцце закона гармоніі грамадства і прыроды. Старажытны чалавек уяўляў, што ўсё вакол яго такое ж жывое, як і ён сам, што прырода таксама мае душу. Безабаронны перад стыхіямі ён імкнуўся даць сваё тлумачэнне вышэйшым над ім стыхіям прыроды. Так з’явіўся пантэон багоў і вялікі шэраг міфалагічных істот, якія былі надзелены надзвычайнымі якасцямі, мелі свае звычкі і асаблівую атрыбутыку, у тым ліку і колеравую.

Асновай беларускай фалькларыстыкі з’яўляецца трыкалор (белы, чырвоны і чорны), які можна лічыць нейкім універсальным кодам беларускай культуры. Гэта каляровая гама адпавядала трохсфернаму падзелу света: неба давала святло, і таму было звязана з белым колерам; зямля – ўсё, што квітнее, усё яркае, вясёлае, радаснае, прыгожае – значыць чырвоны колер; чорны колер асацыяваўся з падзем’ем, пеклам і смерцю.

Усе галоўныя багі славян – Сварог (той, хто стварыў свет, на санскрыце літаральна Бацька Святла) і яго дзеці Пярун, Дажджбог, Светавіт, а таксама назвы сонца розных пораў года – Ярыла, Купала, Багач, Каляда – усе багі святла і агню, таму атрыбутыка іх абавязкова змяшчае белы колер.

Напрыклад Ярылу ўяўлялі маладым прыгожым юнаком. Ён раз’язджае на белым кані ў белым плашчы. На галаве яго вянок. У руках каласы. Ярыла – бог урадлівасці і кахання. У Юр’еў дзень Ярыла па загадзе маці адмыкае браму неба і на белым кані прыязджае на зямлю. З яго ўзнікненнем пачынаецца сапраўдная вясна.

Каляда – багіня неба, маці Сонца, жонка Дажджбога таксама была апранута ў белае адзенне, яна нараджала Новы год, Сонца і Божыча. Падчас калядных святаў спявалі такія песні:

*Прыехала Каляда на белым кані / Яеконічак – ясен месячык, / Яе дружачка – ясна зорачка, / Яе пужачка – ясна звёздачка, / Яе вазочак – з тоўстага лядку, / Яе кажушочак – з белага сняжку.*

У ліку старажытных паданняу беларусаў захавалася памяць і пра Белбога (Прабога), бацьку Перуна, якога завуць Белуном. Бялун часам сыходзіць на зямлю, гэта стары з доўгай белай барадою, у белым адзенні і з кіём ў руках. Ён літасцівы і творыць адно дабро. Ён паказваецца толькі ў дзень, пры сонечным святле, і, калі сустрэне ў дрымучым лесе вандроўніка, які заблукаў, ён выведзе яго на вялікую дарогу. Таму існуе прымаўка: *Без Белуна цёмна ў лесе.*

Ёсць даследаванні, якія даказваюць, што корань *куп* (*Купала*) значыць ‘белы’. Андрэй Меер у «Апісанні Крычаўскага графства» адзначаў, што Купала найбольш часта ўзгадваецца ў песнях беларускіх сялян.

*Йшла Купала сялом, сялом, / Закрыўшы вочкі пяром, пяром. / На Йвана Купала, на Йвана Купала. / Вітала хлопцаў чалом, чалом, / Свяціла ночкі агнём, агнём. / Пляла вяночкі шаўком, шаўком, / Ой, белым шаўком, шаўком, /Славу Купалу пяём, пяём.*

Такім чынам, белы колер – сімвал неба, святасці, велічы і чысціні, дарэчы не толькі боскай, але і дзявочай:

*Не бяры, сыначку, ды што ў золаце! / Не бяры, сыначку, ды што ў серабры! / А бяры, сыначку, што ў беленькім! / А што ў золаце, то паненачка, то гультаечка, / А што ў серабры, то цыганачка, то абманачка, / А што у беленькім, то работніца.*

Чырвоны колер у беларусаў – сімвал сонца, агню, жыцця, дабрабыту. Першапачаткова гэты колер называўся *руды*, затым *чэрлены*, *чэрваты*, *чырвоны*. У мове засталіся абодва старажытныя словы *руды* і *чырвоны*, а таксама *красны*, але ўжо толькі ў сэнсе прыгожы, самы лепшы. Найбольш часта сустракаецца слова *красны* ў вяснянках, якімі клікалі, звалі, прызывалі, гукалі вясну. Такое незразумелае, яшчэ абстрактнае паняцце, як прыход вясны, старажытны чалавек пераводзіў у зразумелыя антрапаморфныя формы – Вясну-жанчыну:

*Вясна красна, вясна красна / Да што ж ты нам прынясла? / Шалковую траву на вясну, / Буйнае жыта на лета. / Малым дзеткам па яечку. / Старым дзедкам па кіёчку. / Маладым маладком па бёрдзечку...* .

Чырвоны таксама сімвалізуе ўсё, што квітнее:

*Красныя цвяточкі нам на вяночкі / Завеставаннейка святое, / Пашлі сонека залатое.*

Але сімволіка чырвонага колеру не абмяжоўваецца радасцю, прыгажосцю і каханнем. Гэты колер, з іншага боку, сімвалізуе варожасць, помсту і агрэсію. Нядобрыя міфічныя істоты ўяўляліся чорнымі з чырвонымі вачамі. На самой справе чорны і чырвоны – колеры-антыподы. Вечаровае сонца на даляглядзе, полымя вогнішча, якое дагарае, – былі чырвонымі. А пасля надыходзіў змрок, поўны жаху і небяспекі.

Чорны колер у беларусаў асацыіруецца з падзем’ем, пеклам, смерцю. Першапачаткова слова *чорны* мела значэнне ‘няясны, няпоўны, нічый’. Паступова выспела рэзка негатыўнае адценне, звязанае з ліхам, ноччу, цемрай, светам памерлых. Чорнымі былі нядобрыя багі і духі. У паганстве чорных жывёлаў прыносілі ім у ахвяру.

Баба-Яга, ці Ягіня, – злая чараўніца, страшная, чорная старая, пра якую гаворыцца, што яна *ў ступе ездзіць, таўкачом паганяе, а памялом след замятае*.

Чорт, паводле народных уяўленняў, мае цялесны вобраз: *ён па выгляду чорны, калматы, на галаве ў яго двое невялікіх рагоў, ззаду хвост, на нагах і руках шмат вострых кіпцюроў, цела пакрыта поўсцю. Згодна з перакананнем людзей, жыве ён ў пекле, якое памяшчаецца недзе ў глыбіні зямлі. На зямлю выходзіць толькі для спакушэння чалавека і авалодання аго душою ды на дапамогу ведзьмам і чарадзеям*.

Між іншым, сустракаюцца чорныя істоты, якія не ўспрымаюцца негатыўна. Прыкладам можна лічыць пасланніка Вужынага цара – чорнага сабаку, які спрыяе паляванню і дапамагае ва ўсіх справах. Здабыць жа такога памочніка было вельмі няпроста. Для гэтага трэба было атрымаць карону Вужынага цара: праз усе перашкоды прайсці да магічнай гары, а там, убачыўшы вужа, паслаць яму белы абрус. На яго ён і скіне сваю карону. Пасля прыняцця хрысціянства гэта павер’е трансфармавалася: на змену Вужынаму цару прыйшоў добры купальскі дзядок з поўным кошыкам папараць-кветак. Нязменна ўладальнік такіх скарбаў надзяляўся дзівоснымі здольнасцямі: пачынаў разумець мову дрэў, жывёл і птушак, станавіўся празарлівым і мудрым. Такім чынам, нельга сцвярджаць, што чорны колер мае абсалютна негатыўную характарыстыку.

Безумоўна, белы, чырвоны і чорны, так званы трыкалор, – самая распаўсюджаная гама ў беларускім фальклоры, але на гэтым нельга закрываць скарбонку народнай творчасці.

Сімволіка вусна-паэтычнай творчасці змяшчае ў сабе ідэі, пачуцці, сістэму маральна-этычных імператываў, вызначае духоўную сувязь у бясконцай повязі пакаленняў.